# МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ЭАР

*М. С. Рак*

**БДПУ (Мінск)**

***Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.***

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца спецыфіка вывучэння творчасці Людмілы Рублеўскай з выкарыстаннем электронных адукацыйных рэсурсаў (ЭАР), вызначаюцца асноўныя патрабаванні да распрацоўкі падобных рэсурсаў і іх кампаненты.

**Ключавыя словы:** методыка навучання; электронныя адукацыйныя рэсурсы; мультымедыйныя сродкі навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Імклівае развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій скіроўвае настаўніка да пошуку аптымальнай траекторыі іх прымянення ў вучэбным працэсе. Шырокае ўкараненне электронных адукацыйных рэсурсаў (ЭАР) у вучэбны працэс з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця айчыннай сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі, што звязана з маштабнай інфарматызацыяй і камп'ютарызацыяй усіх сфер грамадскага жыцця. На сучасным этапе ў нашай краіне ажыццяўляецца распрацоўка электронных адукацыйных рэсурсаў, і вучэбны прадмет «Беларуская літаратура» не з'яўляецца выключэннем. Таму ўзнікла патрэба ў пошуку актыўных форм, метадаў і спосабаў выкарыстання ЭАР у практыцы прадметнага навучання, у прыватнасці беларускай літаратуры, ролю якой цяжка пераацаніць. ЭАР па беларускай літаратуры павінен быць створаны на высокіх навукова-метадычным і тэхнічным узроўнях і поўнасцю адпавядаць патрабаванням «Адукацыйнага стандарту вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (I–XI класы)», «Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура»«, вучэбнай праграме «Беларуская літаратура», павінен мець адрозненні ад традыцыйных выданняў [2, с. 11], што выяўляюцца ў:

– інтэрактыўнасці: рэагаванне ЭАР на патрабаванні вучняў, стварэнне ўмоў аналізу-дыялогу праз сістэму «камп'ютар – настаўнік – вучань – камп'ютар»;

– актуалізацыі: хуткае абнаўленне і дапаўненне вывучаемага метадычнага (для настаўніка) або літаратурна-крытычнага (як для настаўніка, так і для вучня) матэрыялу;

– інтэграцыі: магчымасць звароту да іншых электронных крыніц атрымання патрэбнай інфармацыі (электронныя пошукавыя сістэмы, парталы бібліятэк, Internet-сайты беларускіх мастакоў слова і г.д.);

– адаптацыі: арыентаванне ЭАР на ўзроства-індывідуальныя асаблівасці і здольнасці кожнага з вучняў, зацікаўленых у атрыманні грунтоўных ведаў пры вывучэнні твораў сучаснай беларускай прозы праз мэтанакіраваную арганізацыю самаадукацыі і разнастайныя формы кантролю;

– візуалізацыі: увядзенне схематычна-графічнага і ілюстрацыйнага матэрыялу, фрагментнага ці поўнага варыянту аўдыё- і відэаматэрыялаў (музычныя творы, аўдыякнігі, дакументальныя і мастацкія стужкі, тэатральныя пастаноўкі і іншае).

Яшчэ раз адзначым, што ЭАР пры вывучэнні сучаснай беларускай прозы ў XI класе павінен адпавядаць агульнадыдактычным прынцыпам навуковасці, даступнасці, свядомай актыўнасці, сістэмнасці і паслядоўнасці.

Пры ўвядзенні ў адукацыйны працэс твораў сучаснай беларускай прозы ЭАР павінен ажыццяўляць такія віды вучэбнай дзейнасці вучняў, як:

– актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў, скіраваная на развіццё літаратурна-аналітычных здольнасцей школьнікаў, іх маўленчай культуры, творчай і даследча-пошукавай дзейнасці;

– пашырэнне развіцця эстэтычнага ўспрымання літаратурнага твора як мастацкай цэласнасці (адзінства зместу і формы) і, разам з тым, выразнае ўсведамленне месца літаратурнага твора ў творчасці пісьменніка і ў літаратурным працэсе (як нацыянальным, так і сусветным);

– павелічэнне інфарматыўнасці, заснаванай на папаўненні і абнаўленні новага матэрыялу, які адпавядае ўзроставаму развіццю вучняў;

– арыентацыя на аптымізацыю вучэбнага працэсу, скіраваная на паспяховае дасягненне акрэсленых настаўнікам вучэбных мэт праз супастаўленне літаратурнага твора з творамі іншых відаў мастацтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– пашырэнне індывідуалізацыі, арыентаванай на магчымасці ЭАР спрыяць выбару вучнямі разнастайных шляхоў і спосабаў паспяховага засваення ведаў пры ўспрыманні літаратуры як сінтэтычнага віду мастацтва.

Працэс вывучэння сучаснай беларускай прозы з выкарыстаннем ЭАР павінен пачынаецца з сістэмнай працы настаўніка над планаваннем і пастаноўкай канкрэтных задач, якія павінны быць зарыентаваны на сістэмны падыход да праектавання вучнёўскай дзейнасці, тым самым пашыраючы эфектыўнасць навучання ў межах невялікай колькасці вучэбных гадзін на аснове выкарыстання магчымасцей ЭАР.

Настаўніку для правядзення ўрокаў беларускай літаратуры з выкарыстаннем ЭАР варта скіраваць сваю ўвагу на адбор зместу вучэбнага матэрыялу. Гэта дапамагае развіваць індывідуальна-інтэлектуальныя здольнасці школьнікаў, якія, на думку І. М. Гоўзіч і І. Л. Шаўляковай-Барзенкі, павінны «не толькі правільна ацэньваць канкрэтныя творы, але і характарызаваць іх у кантэксце гістарычнага развіцця культуры, мастацтва свайго народа і чалавецтва ў цэлым, умець суадносіць канкрэтныя з’явы роднай літаратуры з асноўнымі этапамі, перыядамі развіцця сусветнай літаратуры, з мастацкімі напрамкамі» [1, с. 3].

Модуль ЭАР «Людміла Рублеўская» – самастойны гіпертэкставы інтэрактыўны электронны вучэбны дапаможнік комплекснага прызначэння, які забяспечвае бесперапыннасць і поўнасць працэсу навучання і ўтрымлівае арганізаваныя і сістэматызаваныя тэарэтычныя, практычныя, кантралюючыя матэрыялы з выкарыстаннем элементаў мультымедыятэхналогій:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Арганізацыйна-метадычны блок (анатацыя, змест, метадычныя рэкамендацыі).
2. Змястоўны блок.
2. 1. Інфармацыя (кароткія звесткі пра жыццё і творчасць).



Navigation: Людміла Рублеўская >

Біяграфія

Ад аўтара
Людміла Рублеўская
Аўтабіяграфія
Біяграфія
Творчасць
Хрэстаматыя
Паэзія
Крокі па старых лесвіцах
Замак месячнага сяйва
Рыцарскія хронікі
Над замкавай вежай
Шыпшына для пані
З'яўленне інфанты
Проза
Шляхецкія апавяданні
Сэрца мармуровага анёла
Старасвецкія міфы горада Б*
Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію
Сутарэнні Ромула
Авантуры студыёзуса Вырвіча
Драматургія
Апошнія гастролі Агасфера
Фотагалерэя
Медыятэка
Спасылкі
Літаратура
Даведнік



Людміла Рублеўская, сапраўднае імя Людміла Іванаўна Шніп — беларуская паэтэса, пісьменніца, літаратурны крытык.

Людміла Рублеўская нарадзілася ў Мінску ў 1965 годзе. Сярэдняй школы не скончыла, пайшла ў архітэктурна-будаўнічы тэхнікум на аддзяленне архітэктуры, пасля сканчэння якога два гады працавала на вытворчым аб'яднанні "Гарызонт" тэхнікам-архітэктарам, аздабляючы працоўныя інтэр'еры. Паралельна пачала друкаваць вершы ў перыядычным друку і прыходзіць да беларушчыны пад уплывам Уладзіміра Караткевіча, Максіма Багдановіча і ўласнага рамантызму.

У 1986-м годзе паступіла ў Літаратурны інстытут імя Горкага ў Маскве на аддзяленне паэзіі, адкуль вярнулася праз год ужо разам з мужам, паэтам Віктарам Шніпом і перавялася на беларускае аддзяленне філфака БДУ. Працавала ў газеце "Наша слова", часопісе "Першацвет", тыднёвіку "Літаратура і мастацтва". У "ЛіМе" займала пасаду рэдактара аддзела крытыкі і рэгулярна збірала дыскусійны клуб "За гарбатай", дзе сустракаліся беларускія інтэлектуалы. Пасля стварэння холдынгу "Літаратура і мастацтва" адтуль сышла і прыняла прапанову працаваць літаратурным аглядальнікам газеты "СБ-Беларусь сегодня".

Была аўтарам серыі радыёперадач пад назвай "Дзеяслоў" на канале "Культура", у якіх расказвалася пра гісторыю і сучаснасць беларускай мовы.

*Скрыншот 1. Інфармацыя*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2.2. Хрэстаматыя.**

**2.2.1.** Паэзія. Вершы са зборнікаў «Крокі па старых лесвіцах», «Замак месячнага сейва», «Рыцарскія хронікі», «Над замкавай вежай», «Шыпшына для пані».

**2.2.2.** Проза. «Сэрца мармуровага анёла», «Пярсцёнак апошняга імператара», «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега», «Авантуры студыёзуса Вырвіча», «Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча» і інш.




РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*Скрыншот 2. Хрэстаматыя. Проза*

**2.2.3.** Драматургія. «Апошнія гастролі Агасфера».

**3. Вучэбна-метадычны блок**.

**3.1. Кантрольна-вымяральныя матэрыялы.**

**3.1.1.** Запоўніце табліцу «Сучасная беларуская літаратура. Людміла Рублеўская».

| **План** | **Звесткі** |
|---|---|
| Дата і месца нараджэння | |
| Пачатак літаратурнай дзейнасці | |
| Асноўныя этапы творчасці | |
| Індывідуальны стыль | |
| Асноўныя тэмы | |
| Асноўныя жанры | |
| Традыцыі і наватарства | |
| Ацэнка крытыкаў | |
| Уласная (вучнёўская) ацэнка | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3.1.2.** Складзіце мультымедыйную прэзентацыю «Сучасная беларуская літаратура: Людміла Рублеўская».

**3.1.3.** Складзіце анталогію «Сучасная беларуская літаратура: Людміла Рублеўская».

**3.1.4.** Стварыце ўласны інфармацыйны рэсурс, прысвечаны Л. Рублеўскай.

**3.1.5.** Падрыхтуйце разгорнутае маналагічнае выказванне паводле афарыстычных радкоў з паэзіі ці прозы Людмілы Рублеўскай.

### 3.2. Тэсты.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Скрыншот 3. Тэст*

**3.3. Тэматыка даследчых работ:**

а) паэзія: «Вобраз панны ў вершах Л. Рублеўскай», «Краса як эстэтычная дамінанта паэзіі Л. Рублеўскай», «Вобраз рыцара ў паэзіі Л. Рублеўскай», «Гістарызм вершаў Л. Рублеўскай», «Урбаністычныя матывы ў паэзіі Л. Рублеўскай» і інш.;

б) проза: «Жанрава-тэматычны дыяпазон прозы Людмілы Рублеўскай», «Шматсветавасць прозы Л. Рублеўскай», «Дэтэктыў у творчасці Людмілы Рублеўскай», «Паралельны хранатоп прозы Л. Рублеўскай», «Інтэрпрэтацыя гістарычных падзей у прозе Л. Рублеўскай», «Асэнсаванне тэмы сталінскіх рэпрэсій у прозе Л. Рублеўскай», «Як напісаць фанфік (парады ад Л. Рублеўскай)…» і інш.;

б) драматургія: «П’есы Л. Рублеўскай для дзяцей: традыцыі і наватарства», «Антычныя матывы ў драматургіі Л. Рублеўскай…» і інш.

**3.4. Рознае.** Выказванні крытыкаў пра пісьменніцу, тэксты вучнёўскіх сачыненняў, банк праектаў.

**4. Метадычны блок.**

**4.1. Спіс дадатковай літаратуры.**

**4.2. Мультымедыйныя прэзентацыі, інфармацыйны рэсурс (http://lir-book.by/):**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Скрыншот 4. Сайт Людмілы Рублеўскай*

**4.3. Распрацоўкі ўрокаў.**

Такім чынам, блок-модуль «Людміла Рублеўская» ЭАР «Сучасная беларуская проза» забяспечвае неабходным матэрыялам як настаўніка, так і вучняў, можа быць выкарыстаны як пры традыцыйным навучанні, так і дыстанцыйным, улічвае як унутраную інтэграцыю ў межах вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (паэзія – проза – драматургія), так і знешнюю ў межах іншых прадметаў сацыяльна-гуманітарнага цыкла («Гісторыя Беларусі», «Грамадазнаўства», «Мастацтва (айчынная і сусветнай мастацкая культура)», «Музыка», «Выяўленчае мастацтва»), кампактнасць прадстаўлення вучэбна-метадычнага матэрыялу, мае дасканала распрацаваную сістэму кантролю ведаў вучняў.

## *Літаратура*


1. Гоўзіч, І. М. Шукаем шэдэўры!..: (вопыты літаратурных даследаванняў): 11 клас : дапам. для настаўнікаў / І. М. Гоўзіч, І. Л. Шаўлякова-Барзенка. – Мінск : Літ. і мастацтва, 2010. – 88 с.
2. Шалкина, Т. Н. Электронные учебно-методические комплексы: проектирование, дизайн, инструментальные средства / Т. Н. Шалкина, В. В. Запорожка, А. А. Рычкова. – Оренбург : ГУО ОГУ, 2008. – 160 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ